*А.М. Макарэвіч* (Магілёў)

# ПАЭМА ЯНКІ КУПАЛЫ «ЯНА І Я»: АСАБЛІВАСЦІ СЭНСАЎТВАРЭННЯ

Факты твора сведчаць за тое, што мастацкая прастора гэтага тэксту – суб'ектыўная данасць, якая існуе ў ідэальнай прасторы: прасторы думкі, мары, уяўлення, фантазіі, прасторы магучага быць, маючага быць, жаданага быць, а не рэальна існуючага. Інакш кажучы, усё, што адбываецца з Ім і Ёй, – гэта альбо мара героя, альбо яго сон, альбо мроі ў атмасферы штодзённага жыцця. Чым бы гэта ні было – мара, сон, мроя і інш. – яно ўзнікае ў пэўнай рэчаіснасці. **Прасочым, якой жа ёсць для героя гэтая рэчаіснасць і ці дае (дасць) яна магчымасць спаўнення трызненням героя.**

***Раздзел 1 "Стрэча".*** Ён сустракаецца з Ёй на *крыжавых пуцінах* [1, с.106]. Сэнс вобраза *крыжавыя пуціны* ў дадзеным кантэксце двайны: а) раздарожжа ў выглядзе крыжа, б) шляхі, пазначаныя сімвалам *крыж*. У абодвух выпадках на паверхню сэнсаўтварэння ў гэтым кантэксце выходзіць наступнае: для герояў дзве перспектывы – крыж выратавання і крыж пакуты ў сітуацыі экзістэнцыйнага памежжа. Яны пакуль не ведаюць, дзе яны ёсць і куды ім ісці.

Час сустрэчы герояў [1, с.106]; яны – *заблуканыя*: героі-путнікі суб'ектыўна могуць вырашыць для сябе істотнае, аб'ектыўна ж не могуць гэта зрабіць, бо заблукалі *ўночы*. Ён і Яна знаходзяцца на экзістэнцыйным раздарожжы, яны далёкія ад пэўнасці жыцця: пакуль што статычныя, нерухомыя паводле канкрэтнага жыццёвага выбару. Пры гэтым Яна была *ў шлюбнай белі*, а Ён *ахутаны ў мрок*. Яна як аб'ект яго мрояў паўстае як нешта светлае, цнатлівае ў змрочнай рэчаіснасці, у якой знаходзіцца Ён і ў прасторы якой нараджаюцца яго мроі.

Якой жа ёсць гэтая прастора і якой можа быць перспектыва такога шляху? *І мы пайшлі, як тыя **цені-мары**,// Няспынна ад расы і да расы; // **Запаланелі** нам бліскучыя **пажары**. // **Закуранелі** чорныя лясы* [1, с.106]. У такой прасторы знаходзіцца Ён і ў яго свядомасці Яна.

***Раздзел 6 "Агляд поля".*** Адным з цэнтральных вобразаў гэтага раздзела з'яўляецца вобраз *крыжа, крыжоў*. Атмасфера гэтага раздзела вызначаецца светласцю і пэўнай мінорнасцю – гэта ў свядомасці героя, у яго мроях. Але ж рэальнае жыццё не характарызуецца канкрэтна – яно акрэсліваецца на ўзроўні сэнсу мастацкіх вобразаў: *крыжы*; *неба воблік сіні*; паклон *часіне*, якая злучыла героям *у шчасці і жальбе*; *благаславенне жыцця, зямлі і сонца* [1, с.111]. Паклон – сімвал падзякі і прызнання. У дадзеным кантэксце лірычны герой прызнае шчаслівасць мінулага (да моманту гутаркі пра яго)



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

жыцця з ёю, яно для яго прымальнае. Ён блаславляе *жыццё, зямлю, сонца, старыя грушы, вербы на мяжы*, але далей **праклінае** (!) *толькі скону хвілі // І тыя вечныя* [пасля існавання Яго і Яе. – А.М.] *крыжы* [1, с.111]. Як разумець такі факт праклёну, які пасылаецца героем, што нібыта знаходзіўся ў атмасферы гарманічнага яднання са сваёй каханай? Адказ можа мець два сэнсаўтваральныя аспекты. *Першы*. Праклінаецца час, які разлучыць каханых, бо пазазямная прастора для героя аказваецца непрымальнай, яна для яго не існуе, у ёй немагчымая гармонія для Яго і Яе (герой не згадвае такую прастору). Тут важным для разумення сэнсаўтваральнага аспекту з'яўляецца таксама слова ***толькі***. Праклінаецца *толькі* момант адыходу з жыцця, расстанне, разыходжанне герояў. *Другі аспект*. Героі праклінаюць: *няспраўджанасць* іх (у першую чаргу Яго) надзей і мар, якія існавалі найперш у свядомасці Яго, яны (найперш Ён, бо яны – гэта ў свядомасці Яго) праклінаюць жыццёвыя сітуацыі, якія не дазваляюць спраўдзіцца марам і памкненням. Праклінаюцца крыжы, якія будуць стаяць пасля смерці герояў. Натуральна, што смерць Яго і Яе не адбудзецца адразу пасля гэтага пракляцця. Гэта значыць, што героі праклінаюць сваё сённяшняе існаванне, а таксама (!) і тое, што будзе пасля, – яны праклінаюць сваё будучае (перакрэсліваюць яго). Значыць, нягледзячы на тое, што ў свядомасці героя ідылія, яна толькі ў свядомасці (!), перспектыў на шчаслівае заканчэнне гэтай ідыліі няма. Гэта разумее герой і ў стане адчаю праклінае сваю будучыню, якая не мае шчаслівай перспектывы. Чаму праклінаюцца менавіта крыжы? Магчыма (паводле Купалы) таму, што герой усведамляе наступнае: тая ідылія ў адносінах Яго і Яе – гэта толькі вынік фантазіі ў яго свядомасці. Фактычна, герой праклінае жыццё, у якім не дадзена здзейсніцца яго марам, не дадзена дасягнуць яго ідэалу. Але Ён мусіць жыць, таму ў яго свядомасці ўсплываюць жаданыя формы ідылічных адносін яго да яе. Прычым ідылія адносін у свядомасці героя паміж ім і Ёй часам "азмрочваецца" аўтарам некаторымі заўвагамі адносна рэчаіснасці, у якой жывуць героі.

***Раздзел 7 "Радаўніца"***. Тут утрымліваецца пацвярджэнне высноў аб сэнсе пракляцця героямі паэмы крыжоў, якія будуць пасля іх. <...> ***А я жыву на свеце доляй сіраты, // <u>Мяне зямля</u> за нейкі грэх трымае*** [1, с.112]. Такім чынам падкрэсліваецца, што рэальнае існаванне героя на зямлі для яго не мае сэнсу. Яно нямілае яму. Герой знаходзіцца ў стане адчаю, ён незадаволены тым, што ёсць у рэальным жыцці, якое нараджае яго памкненні прарыву з такога змрочнага жыцця хаця б на ўзроўні мараў аб ідыліі і шчасці. І вось такія праклёны і адчай у кантэксце іншых сэнсаўтваральных аспектаў твора дазваляюць зрабіць вывад аб тым, што паэма "Яна і Я" працягвае, паглыбляе адлюстраванне таямнічай і варожай для чалавека экзістэнцыйнай прасторы.

**Літаратура**

1. *Купала Я.* Поўны збор твораў: у 9 т. / Я.Купала. – Мінск: Маст. літ., 1999 – Т.6. – С. 106-119.